# ШТОМЕСЯЧНЫ АГЛЯД ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ

№2 (53)
Люты
2007 г.

- Беларусь наведаў прадстаўнік Парламецкай Асамблеі Рады Еўропы.
- Тэмп эканамічнага росту ў 2006 годзе склаў 9.9%.
- Урэгуляваныя ўмовы пастаўкі нафты ў Беларусь.
- Дэфіцыт гандлю таварамі дасягнуў USD 1.9 млрд.
- Стаўкі акцызаў на нафтапрадукты зніжаныя на 60%.
- Зменшыўся аб’ём рублёвых дэпазітаў насельніцтва.

**Насельніцтва: 9.75 млн чалавек**
**Прамысловасць / ВУП: 27.4%**
**Сельская гаспадарка / ВУП: 7.5%**
**Інвестыцыі / ВУП: 23.3%**
**Экспарт: Расія 35.8%, ЕЗ 44.1%**
**Імпарт: Расія 60.5%, ЕЗ 21.4%**

## Палітыка: Беларусь наведаў прадстаўнік Парламецкай Асамблеі Рады Еўропы

У студзені Беларусь наведаў прадстаўнік Парламецкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАРЕ) Рэнэ ван дэр Ліндэн. Ён правёў шэраг сустрэчаў з прадстаўнікамі афіцыйных органаў улады і апазіцыі, на якіх абмяркоўваліся магчымасці пашырэння супрацы Беларусі з еўрапейскімі структурамі, у прыватнасці адкрыццё офісу Еўрапейскай камісіі ў Мінску. У выпадку прыняцця крокаў па дэмакратызацыі ва ўнутрыпалітычнай сферы, якія ПАРЕ чакае ад Беларусі, парламент краіны можа вярнуць сабе статус спецыяльна запрошанага ў гэтай арганізацыі. Гэта было б важным крокам па развіцці супрацы ў палітычнай і эканамічнай сферах паміж Беларуссю і ЕЗ.

## Рэальны сектар: тэмп эканамічнага росту ў 2006 г. склаў 9.9%

Паводле дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу, у 2006 г. прырост рэальнага ВУП склаў 9.9% (9.4% у 2005 г. паводле ўдакладненых звестак). Хуткі рост эканомікі ў апошнія два гады тлумачыцца галоўным чынам бумам у прамысловасці: паводле нашых ацэнак, яе ўнёсак у прырост ВУП у 2006 г. склаў 4.6 адсоткавага пункту (4.1 адсоткавага пункту ў папярэднім годзе). У сваю чаргу, больш за 40% прыросту прамысловай вытворчасці забяспечыла паліўная прамысловасць. Відавочна, што такі стан рэчаў робіць эканоміку ў значнай ступені залежнай ад сітуацыі ў нафтаперапрацоўцы: простае спыненне росту вытворчасці ў дадзенай галіне прывядзе да зніжэння тэмпу росту ВУП на 2 адсоткавыя пункты.

**Дынаміка рэальнага ВУП**




* прагноз на 2007 г. – Даследчы цэнтр ІПМ.
Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

У 2006 г. павялічыўся ўнёсак інвестыцыяў у прырост ВУП. Паводле афіцыйных дадзеных, у параўнальных цэнах яны выраслі на 31.4% (20% у 2005 г.). Пры гэтым у намінальным выражэнні іх прырост выявіўся меншым, чым у рэальным, хоць сродкі вытворчасці за 2006 г. падаражэлі на 9%. Сярод крыніцаў капіталаўкладанняў вырасла роля бюджэту і крэдытаў банкаў: іх удзельная вага ў структуры інвестыцыяў павялічылася ад 40.8% у 2005 г. да 44.5% у 2006 г. Улічваючы негатыўныя вынікі падаражання энерганосьбітаў для бюджэту і банкаўскага сектару, дадзеныя крыніцы інвестыцыяў могуць выявіцца абмежаванымі.

## Структурныя тэндэнцыі: урэгуляванне ўмоваў пастаўкі сырой нафты з Расіі ў Беларусь

**Энергетыка.** Пасля канфлікту, які ўзнік у пачатку студзеня па пытаньнях паставак расійскай нафты ў Беларусь, 12 студзеня ўрады дзьвух краінаў падпісалі пагадненне аб умовах пастаўкі сырой нафты ў Беларусь і наступнага экспарту нафтапрадуктаў з яе тэрыторыі. Пагадненне прадугледжвае, што Беларусь будзе спаганяць пры экспарце нафтапрадуктаў са сваёй тэрыторыі мыты па стаўках і ў парадку, існуючым у Расіі. Расія будзе выкарыстоўваць да экспарту сырой нафты ў Беларусь мыту, скарэктаваную на

Даследчы цэнтр ІПМ

Нямецкая эканамічная група ў Беларусі

220088 г. Мінск, вул. Захарава, 76
Тэл./факс +375 (17) 210 0105
Электронная пошта bmer@research.by
Вэб-сайт http://research.by/

© Даследчы цэнтр ІПМ, 2007

каэфіцыент выпраўлення. У 2007 г. ён складзе 0.293, у 2008 г. – 0.335, у 2009 г. – 0.356. Лічыцца, што такім чынам ажыццяўляецца падзел мытаў на нафтапрадукты, экспартаваныя з Беларусі (гэтага на перамовах дамагалася Расія), аднак Расія атрымае яе долю загадзя, пры пастаўцы нафты ў Беларусь.

30 студзеня Беларусь узгадніла з расійскімі кампаніямі – пастаўшчыкамі нафты новую формулу кошту на нафту. Згодна з гэтай формулай, кошт нафты для Беларусі складзе сусветны кошт плюс мыту, вызначаную для Беларусі. Ад увядзення мыты на нафту для Беларусі расійскі бюджэт атрымае больш за USD 1 млрд, фактычна пераразмеркаваўшы на сваю карысць звышпрыбыткі расійскіх пастаўшчыкоў нафты. Для Беларусі новы кошт нафты знаходзіцца на ўзроўні мінулагодняга (з-за зніжэння сусветных коштаў на нафту). Такім чынам, увядзенне мыты не прывядзе да павелічэння коштаў імпарту нафты ў 2007 г.

### Знешні гандаль: дэфіцыт гандлю таварамі дасягнуў USD 1.9 млрд

У студзені-лістападзе 2006 г. экспарт тавараў вырас на 23.5% г/г, імпарт – на 34.0% г/г. У выніку дэфіцыт гандлю таварамі склаў USD 1.9 млрд (USD 0.5 млрд у студзені-лістападзе 2005 г.). Больш за 90% гэтага дэфіцыту сфармавалася за кошт гандлю па артыкуле "іншыя прамежкавыя тавары", куды ўваходзяць сыравіна, матэрыялы і камплектуючыя. Шмат у чым гэта было абумоўлена зніжэннем экспарту ключавых прамежкавых тавараў – калійных угнаенняў і лесаматэрыялаў – пры адначасовым павелічэнні імпарту прамежкавых тавараў.

У выніку павышэння цэнаў на газ і змены ўмоваў паставак сырой нафты з Расіі, агульны кошт імпарту прамежкавых тавараў у 2007 г. павялічыцца. Пры гэтым ён не будзе цалкам кампенсаваны павелічэннем экспарту. Такім чынам, у 2007 г. можна чакаць істотнага росту дэфіцыту ў гандлі таварамі, для фінансавання якога патрэбна будзе прыцягненне сродкаў па фінансавым рахунку, напрыклад, знешніх пазыкаў альбо замежных інвестыцыяў.

### Дзяржаўныя фінансы: акцызы на нафтапрадукты зніжаныя на 60%

За студзень-лістапад 2006 г. гадавы план па даходах кансалідаванага бюджэту быў выкананы на 97.7% (93.7% у 2005 г.). Даходы склалі BYR 34.5 трлн ці 48.8% ад ВУП, што на 0.4 адсоткавага пункту болей, чым за гэты ж перыяд папярэдняга году. Пры гэтым выдаткі скараціліся на 0.6 адсоткавага пункту і склалі 45.4% ад ВУП (BYR 32.1 трлн). У выніку прафіцыт бюджэту склаў 3.4% ад ВУП (2.3% на год раней).

Згодна з новымі умовамі экспарту нафтапрадуктаў, даход беларускага бюджэту ад экспартных мытаў у 2007 г. можа дасягнуць USD 1.9 млрд (USD 0.2 млрд у 2006 г.). Частка гэтага даходу (USD 0.6 млрд) дзяржава верне экспарцёрам праз зварот падатку на дададную вартасць (ПДВ), аднак нагрузка на іх усё роўна значна павялічыцца. Таму ўрад вырашыў прыняць шэраг зменаў падатковай сістэмы, накіраваных на зніжэнне падатковай нагрузкі на экспарцёраў. З 1 студзеня 2006 г. на 60% зніжаныя акцызы на нафтапрадукты і скасаваны шэраг плацяжоў з выручкі ад рэалізацыі нафтапрадуктаў (збор у рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і падатак з карыстальнікаў аўтамабільных дарог). Такім чынам, даход бюджэту павялічыцца за кошт экспартных мытаў і знізіцца за кошт змяншэння акцызаў і звароту ПДВ экспарцёрам.

**ВУП і прамысловая вытворчасць**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Унёсак у прырост прамысловай вытворчасці ў 2006 г.**

| | тэмп прыросту | унёсак у прырост |
|---|---|---|
| Электраэнергетыка | 3.1 | 0.2 |
| Паліўная | 23.1 | 4.7 |
| Чорная металургія | 11.2 | 0.4 |
| Хімічная і нафтахімічная | 6.9 | 0.7 |
| Машынабудаванне і металаапрацоўка | 10.0 | 2.2 |
| Дрэваапрацоўка | 2.9 | 0.1 |
| Будаўнічых матэрыялаў | 14.7 | 0.4 |
| Лёгкая | 2.6 | 0.1 |
| Харчовая | 6.7 | 1.0 |
| Іншыя | 12.4 | 1.4 |
| Прамысловасць, усяго | 11.3 | 11.3 |

Заўвага. Тэмп прыросту – % г/г; унёсак у прырост – адсоткавых пунктаў.
Крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Дынаміка знешняга гандлю таварамі**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Экспарт і імпарт груп тавараў у студзені-лістападзе 2006 г.**

| Таварныя группы: | экспарт | імпарт | сальда |
|---|---|---|---|
| Інвестыцыйныя | 2.2 | 2.1 | 0.1 |
| Прамежкавыя: | 12.8 | 14.3 | -1.5 |
| энергетычныя | 6.8 | 6.6 | 0.2 |
| іншыя прамежкавыя | 5.9 | 7.7 | -1.7 |
| Спажывецкіе: | 3.0 | 3.3 | -0.3 |
| харчовыя | 1.3 | 1.3 | 0.0 |
| нехарчовыя | 1.7 | 2.0 | -0.3 |
| Усяго | 18.1 | 19.9 | -1.9 |

Крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Аднак нават калі агульная сума даходаў бюджэту ў 2007 г. вырасце, сітуацыя з яго выкананнем не палепшыцца, бо падаражанне энерганосьбітаў пацягне за сабой павелічэнне выдаткаў бюджэту.

### Манетарная палітыка: зменшыўся аб’ём рублёвых дэпазітаў насельніцтва

У снежні 2006 г. на валютным рынку адбылося ажыятажнае павелічэнне попыту на замежную валюту, часткова звязанае з канфліктам Беларусі з Расіяй па пытанні паставак энерганосьбітаў. Як і ў папярэднія месяцы, асноўную ролю ў задавальненні ўзрослага попыту адыгралі камерцыйныя банкі, скарачаўшы свае замежныя актывы і павялічыўшы прапанову валюты на ўнутраным рынку. Чыстыя замежныя актывы (ЧЗА) банкаў скараціліся ў снежні на USD 691 млн, у той час як ЧЗА органаў грашова-крэдытнага рэгулявання скараціліся толькі на USD 15.0 млн (1% м/м). Традыцыйным для снежня асноўным фактарам росту грашовай прапановы стала зніжэнне рэшты рублёвых сродкаў на рахунках ураду ў НБВ (на 33.2% м/м), звязанае з павелічэннем бюджэтных выдаткаў напрыканцы году. Аднак у снежні 2006 г. зніжэнне дэпазітаў ураду ў НББ было нашмат меньшым, чым у снежні 2005 г. У выніку за снежань грашовая база павялічылася на 18.0% м/м, а ў гадавым вымярэнні яе рост істотна запаволіўся – да 19.8% г/г (41.0% г/г у лістападзе 2006 г. і 73.7% г/г у 2005 г.).

Сезоннае павелічэнне дзелавой актыўнасці ў снежні садзейнічала захаванню высокага попыту на крэдыты. Тэмп росту крэдытавання эканомікі працягваў павялічвацца і дасягнуў 57.2% г/г (55.4% г/г у лістападзе). Узрослая дзелавая актыўнасць адначасова забяспечыла рост рэсурсовай базы банкаў за кошт пераводных дэпазітаў прадпрыемстваў. Апроч таго, значнай крыніцай пасіваў для банкаў сталі сродкі, вернутыя з-за мяжы. Таму на крэдытна-дэпазітным рынку адбываліся толькі нязначныя карэкцыі працэнтных ставак. Аднак на фоне напружаных перамоваў з Расіяй насельніцтва скараціла попыт на беларускія рублі, захоўваючы грошы ў замежнай валюце. Тэрміновыя дэпазіты насельніцтва ў рублях за снежань скараціліся на 1.3% м/м. У гадавым вымярэнні рост запаволіўся да 47.9% г/г (56.4% г/г у лістападзе), а ў замежнай валюце – паскорыўся да 33.5% г/г (29.9% г/г у лістападзе). Тэмп росту наяўных грошаў склаў 39.8% г/г (46.0% г/г у лістападзе). Рублёвая грашовая маса павялічылася ў лістападзе на 8.5% м/м, шырокая грашовая маса – на 7.5% м/м. У гадавым вымярэнні тэмпы іх росту склалі адпаведна 44.5 і 39.3% г/г (51.3 і 42.2% г/г у лістападзе).

Спажывецкія цэны ў снежні выраслі на 0.8% м/м, а ў гадавым разліку інфляцыя склала 6.6% г/г, то бок вярнулася да кастрычніцкага ўзроўню. Найбольш заўважным было павышэнне коштаў на бензін – у снежні ён падаражаў на 4.7% м/м, ці на 22.4% г/г, што значна вышэй за тэмпы інфляцыі. Курс беларускага рубля ў адносінах да даляра ЗША ў студзені не змяніўся і склаў 2140 BYR/USD.

### Банкаўскі сектар: тры банкі – рэзідэнты свабодных эканамічных зонаў пазбаўленыя ліцэнзіяў

Напрыканцы снежня – напачатку студзеня НББ адклікаў агульную і генеральную ліцэнзіі ў трох банкаў: ЗАТ “Атамбанк”, ААТ “Міжнародны рэзервовы банк” і ААТ “Інвестпрамбанк”. Падставамі для адклікання ліцэнзіяў стала невыкананне названымі банкамі, якія з’яўляліся рэзідэнтамі свабодных эканамічных зонаў, патрабаванняў аб мінімальнай велічыні ўласнага капіталу ў памеры EUR 5 млн.

**Кансалідаваны бюджэт**




Крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Грашовая база і ІСЦ**




Крыніца: разлікі па дадзеных НББ і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Стаўка рэфінансавання**




Крыніца: разлікі па дадзеных НББ і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Раней для рэгістрацыі банку ў СЭЗ хапала ўласнага капіталу ў памеры EUR 0.5 млн, аднак напрыканцы 2005 г. НББ скасаваў такія ўмовы функцыянавання для гэтых банкаў, і яны пачалі дзейнічаць паводле агульных нормаў рэгулявання банкаўскай дзейнасці. Асноўнай дзейнасцю дадзеных банкаў было абслугоўванне юрыдычных асобаў – рэзідэнтаў СЭЗ, а ліцэнзію на прыцягненне сродкаў ад фізічных асобаў мела толькі ААТ "Міжнародны рэзервовы банк". Па той прычыне, што названыя банкі не ўплывалі значна на сістэму ў цэлым, бо ўдзельнічалі толькі ў міжбанкаўскіх аперацыях з невялікімі аб'ёмамі здзелак, іх ліквідацыя не будзе мець вялікага ўплыву на фінансавы сектар краіны.

| Эканамічныя тэндэнцыі | | 1 кв. 05 | 2 кв. 05 | 3 кв. 05 | 4 кв. 05 | 1 кв. 06 | 2 кв. 06 | 3 кв. 06 | вер. 06 | кас. 06 | ліс. 06 | сне. 06 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рост рэальнага ВУП | % г/г | 9.9 | 8.4 | 8.7 | 10.7 | 11.0 | 9.6 | 8.6 | 10.8 | -- | -- | -- |
| Рост рэальнага ВУП | % г/г нар. | 9.9 | 9.1 | 9.0 | 9.4 | 11.0 | 10.3 | 9.6 | 9.9 | 9.7 | 9.9 | 9.9 |
| Рэальная прамысловая вытворчасць | % г/г нар. | 11.7 | 10.3 | 9.7 | 10.5 | 13.5 | 12.6 | 12.2 | 11.3 | 12.2 | 11.9 | 11.3 |
| Рэальная сельскагаспадачая вытворчасць | % г/г нар. | 12.5 | 10.1 | 3.0 | 2.1 | 10.1 | 6.9 | 2.2 | 6.1 | 3.7 | 5.6 | 6.1 |
| ІСЦ | % г/г к/п | 11.9 | 10.0 | 9.8 | 8.0 | 6.8 | 7.0 | 6.4 | 6.6 | 6.2 | 7.6 | 6.6 |
| ІЦВПП | % г/г к/п | 14.2 | 12.1 | 10.5 | 10.2 | 8.3 | 8.1 | 8.0 | 8.5 | 7.7 | 7.8 | 8.5 |
| Экспарт тавараў (USD)* | % г/г | 21.8 | 17.2 | 15.1 | 11.5 | 27.5 | 24.9 | 29.3 | -- | 21.5 | 13.2 | -- |
| Імпарт тавараў (USD)* | % г/г | 0.6 | 3.6 | 7.8 | -5.3 | 51.3 | 37.0 | 30.0 | -- | 24.6 | 14.2 | -- |
| Сальда гандлю таварамі (дадзеныя НББ) | USD млн. нар. | 452 | 345 | 43 | -527 | -134 | -785 | -1220 | -- | -1449 | -1683 | -- |
| Бягучы рахунак | USD млн нар. | 723 | 945 | 989 | 469 | 126 | -305 | -492 | -- | -- | -- | -- |
| Бягучы рахунак | % ВУП нар. | 12.1 | 7.3 | 4.6 | 1.6 | 1.7 | -1.9 | -1.9 | -- | -- | -- | -- |
| Міжнародныя рэзервы | USD млн к/п | 975 | 1130 | 1189 | 1297 | 1290 | 1154 | 1155 | 1383 | 1279 | 1369 | 1383 |
| Грашовая база | % г/г к/п | 21 | 39 | 50 | 74 | 53 | 48 | 38 | 20 | 32 | 41 | 20 |
| Стаўка па крэдытах у беларускіх рублях** | % гадавых, к/п | 19 | 15 | 14 | 12 | 12 | 11 | 12 | 12 | 12 | 12 | 12 |
| Абменны курс (афіцыйны) | BYR/USD с/п | 2164 | 2151 | 2150 | 2150 | 2151 | 2146 | 2142 | 2141 | 2141 | 2140 | 2140 |
| Абменны курс (афіцыйны) | BYR/EUR с/п | 2840 | 2713 | 2623 | 2558 | 2587 | 2694 | 2729 | 2761 | 2701 | 2755 | 2827 |

* тэмпы росту даляравых паказнікаў (крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу).
** намінальная стаўка па новых крэдытах юрыдычным асобам (крыніца: НББ).
Крыніцы: Міністэрства статыстыкі і аналізу і НББ.

| Асноўныя эканамічныя паказнікі | | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Намінальны ВУП* | BYR трлн | 9.134 | 17.173 | 26.613 | 36.565 | 49.991 | 65.067 | 79231 |
| Намінальны ВУП ** | USD млрд | 8.7 | 12.1 | 14.5 | 17.7 | 23.1 | 30.2 | 36.9 |
| Рост рэальнага ВУП | % г/г | 5.8 | 4.7 | 5.0 | 7.0 | 11.4 | 9.4 | 9.9 |
| Прамысловая вытворчасць | % г/г | 7.8 | 5.9 | 4.5 | 7.1 | 15.9 | 10.5 | 11.3 |
| Сельскагаспадарчая вытворчасць | % г/г | 9.3 | 1.8 | 0.7 | 6.6 | 12.6 | 1.7 | 6.1 |
| ІСЦ | % г/г с/п | 168.6 | 61.1 | 42.6 | 28.4 | 18.1 | 10.3 | 7.0 |
| ІСЦ | % г/г к/п | 107.5 | 46.1 | 34.8 | 25.4 | 14.4 | 8.0 | 6.6 |
| ІЦВПП | % г/г с/п | 185.3 | 72.1 | 41.4 | 37.5 | 24.1 | 12.1 | 8.3 |
| ІЦВПП | % г/г к/п | 166.4 | 40.9 | 42.7 | 28.1 | 18.8 | 10.0 | 8.5 |
| Экспарт (т/п, USD) | % г/г | 17.6 | 10.4 | 8.6 | 24.0 | 38.3 | 15.6 | -- |
| Імпарт (т/п, USD) | % г/г | 21.0 | 8.2 | 9.1 | 27.1 | 41.4 | 4.0 | -- |
| Бягучы рахунак | USD млн | -338 | -394 | -311 | -424 | -1206 | 469 | -- |
| Бягучы рахунак | % ВУП | -3.9 | -3.2 | -2.1 | -2.4 | -5.2 | 1.6 | -- |
| ПЗІ (чыстыя) | USD млн | 119 | 96 | 453 | 170 | 163 | 303 | -- |
| Міжнародныя рэзервы | USD млн | 357 | 347 | 457 | 474 | 770 | 1297 | 1383 |
| Сальда дзяржбюджэту*** | % ВУП | -0.6 | -1.6 | -0.2 | -1.6 | 0.0 | -0.6 | -- |
| Унутраны дзяржаўны доўг | % ВУП к/п | 4.5 | 6.1 | 5.4 | 5.5 | 5.7 | 5.8 | 6.5 |
| Знешні доўг (сукупны) | % ВУП к/п | 24.4 | 24.8 | 27.0 | 23.7 | 21.4 | 17.9 | -- |
| Грашовая база | % г/г к/п | 52 | 225 | 32 | 50 | 42 | 74 | 20 |
| Абменны курс (НББ)* | BYR/USD с/п | 1035 | 1394 | 1784 | 2075 | 2160 | 2154 | 2145 |
| Абменны курс (НББ)* | BYR/USD к/п | 1213 | 1580 | 1920 | 2156 | 2170 | 2152 | 2140 |
| Спрэд**** | % с/п | 44.4 | 0.8 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 |
| Спрэд**** | % к/п | 2.8 | 0.2 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 |
| Абменны курс (НББ)* | BYR/EUR с/п | 651 | 1239 | 1690 | 2353 | 2684 | 2681 | 2692 |
| Абменны курс (НББ)* | BYR/EUR к/п | 1097 | 1392 | 1989 | 2695 | 2956 | 2550 | 2817 |

* ВУП у даляравым эквіваленце за 1999–2000 гг. разлічаны па рынкавым (неафіцыйным) валютным курсе (крыніца: Даследчы цэнтр ІПМ).
** спрэд паміж безнаяўным курсам ценявога рынку і афіцыйным курсам (крыніца: Даследчы цэнтр ІПМ).
Крыніцы: Міністэрства статыстыкі і аналізу, Міністэрства фінансаў, НББ, Даследчы цэнтр ІПМ.

**Умоўныя азначэнні:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| г/г | змены год да году | млрд | мільярд |
| ІСЦ | індэкс спажывецкіх цэнаў | нар. | нарастаючым вынікам |
| ІЦВПП | індэкс цэнаў вытворцаў прамысловай прадукцыі | НББ | Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь |
| к/п | на канец перыяду | ПЗІ | прамыя замежныя інвестыцыі |
| м/м | змены за месяц | с/п | сярэдняе за перыяд |
| млн | мільён | трлн | трыльён |